# РАБОТУ БІБЛІЯТЭК—НА ЎЗРОВЕНЬ ПАЛІТЫЧНЫХ ЗАДАЧ

У тэзісах таварыша Молатава «Аб трэцім пяцігадовым плане развіцця народнай гаспадаркі СССР» высоўваецца адна з асноўных задач трэцяга пяцігоддзя: завяршэнне будаўніцтва бяскласавага соцыялістычнага грамадства і паступовага пераходу ад соцыялізма к комунізму, комуністычнага выхавання працоўных і пераадалення перажыткаў капіталізма ў сазнанні людзей — будаўнікоў комунізма.

Адсюль вельмі пачэсная і разам з тым адказная задача ўскладаецца на бібліятэчных работнікаў, закліка映ых дапамагаць фарміраваць комуністычнае сазнанне людзей новага грамадства.

Дапамога павінна выражацца ў розных формах прапаганды марксісцка-ленінскай літаратуры, у правядзенні кансультацый па цікавячых чытача пытаннях, дапамозе яму ў самастойнай рабоце над кнігай, правядзенні канферэнцый чытачоў, голаснага чытання асобных раздзелаў гісторыі ВКП(б), а таксама ў падборы адпаведнага мастацкага матэрыялу і т. д.

Гэта работа можа быць з поспехам праведзена там, дзе самі бібліятэчныя работнікі сістэматычна і ўдумліва працуюць над павышэннем свайго ідэйнага ўзроўню.

На нарадзе бібліятэчных работнікаў Менска загадчыца філіяла бібліятэкі імені Пушкіна тав. Чуміцкая расказвала аб тым, як яна, будучы сама дрэнна знаёма з першымі раздзеламі гісторыі ВКП(б), адчувала цяжкасці ў рабоце з чытачамі.

— Я, — гаворыць тав. Чуміцкая, — гублялася, калі чытач мяне пытаў аб тым, што яму чытаць па першых раздзелах падручніка гісторыі ВКП(б). Нельга было і думаць аб дапамозе чытачу, не вывучыўшы самой адпаведнага матэрыялу. Я ўжо вывучыла два раздзелы падручніка гісторыі ВКП(б) і многа дадатковага матэрыялу па гісторыі партыі. Адчуваю свой ідэйны рост, упэўнена гутару з чытачамі і смела рэкамендую ім адпаведную літаратуру па гэтых раздзелах. Працаваць стала значна цікавей.

Вывучаюць гісторыю ВКП(б) тав. Дрэўнёва (бібліятэка Дома настаўніка), тав. Падрэцкі (бібліятэка ім. Пушкіна), тав. Гасман (педвучылішча) і многія іншыя работнікі бібліятэк.

Некаторыя бібліятэкі горада дабіліся значных поспехаў у арганізацыі дапамогі чытачам у вывучэнні гісторыі ВКП(б). Напрыклад, у бібліятэцы Дома настаўніка (заг. бібліятэкай тав. Дрэўнёва) ёсць узорная выстаўка літаратуры па гісторыі ВКП(б), па падрыхтоўцы да XVIII з'езда партыі. Ёсць картатэка марксісцка-ленінскай літаратуры, складзеная па кожнаму раздзелу падручніка гісторыі ВКП(б). Перад чытачом ляжаць усе неабходныя газетныя і журнальныя матэрыялы па гісторыі партыі. Асабліва вабіць вока чытача з вялікай любоўю і стараннасцю аформлены альбом мастацкай літаратуры, рэкамендуемы ў дапамогу вывучаючым гісторыю ВКП(б) да ўсіх 12 раздзелаў.

Вялікую дапамогу аказала гэта бібліятэка Дома сваім чытачам у камплектаванні асабістых бібліятэк па вывучэнню гісторыі ВКП(б). Больш 40 настаўнікаў скамплектавалі асабістыя бібліятэкі.

Не дрэнна пачалі аказваць дапамогу чытачам у вывучэнні гісторыі партыі бібліятэкі Дома Ўрада (загадчык бібліятэкай тав. Ашаровіч), завода імені Молатава і іншыя.

Але большасць бібліятэк горада яшчэ стаяць у баку ад важнейшай палітычнай задачы—арганізацыі дапамогі чытачам, вывучаючым гісторыю ВКП(б).

У бібліятэцы завода імені Кірава (загадчык бібліятэкай тав. Церахава) не аказваецца ніякай дапамогі чытачам у вывучэнні гісторыі партыі. Няма выстаўкі неабходнай літаратуры, рэкамендацыйны спісак адсутнічае, няма асобнай картатэкі марксісцка-ленінскай літаратуры. У рэзультаце такіх безадказных адносін да работы наяўная ў бібліятэцы літаратура па гісторыі партыі не скарыстоўваецца. За 1939 год ніхто з чытачоў не браў ні разу ні аднаго тома твораў класікаў марксізма-ленінізма.

Адсутнічае работа па аказанню дапамогі чытачу і ў раённай менскай бібліятэцы імені Крупскай. Не гледзячы на тое, што бібліятэка мае 1500 чытачоў, у ёй няма рэкамендацыйнага спіска літаратуры па вывучэнню гісторыі партыі, не было ні адной кансультацыі. Ніякай дапамогі чытачам, вывучаючым гісторыю ВКП(б), не аказваецца і ў бібліятэцы 47-й школы.

Дзяржаўную цэнтральную бібліятэку імені Леніна штодня наведваюць сотні і тысячы чытачоў, вывучаючых гісторыю ВКП(б). Бібліятэка мае высокакваліфікаваных работнікаў. Але, не гледзячы на гэта, у бібліятэцы вельмі слаба пастаўлена работа па аказанню дапамогі чытачам у вывучэнні гісторыі ВКП(б). У чытальнай зале няма ні спіскаў рэкамендуемай літаратуры, ні выстаўкі кніг, ні альбомаў. Уся палітычная літаратура выдаецца ў адным аддзеле, г. зн. з падручнікамі па агульнаадукацыйных прадметах. Прыходзіцца доўга чакаць выдачы кнігі па гісторыі партыі. Адсутнасць каталага марксісцка-ленінскай літаратуры затрудняе доступ чытачу да кнігі. Ніякай дапамогі чытачам, вывучаючым гісторыю партыі, не аказвае і кабінет самаадукацыі.

Дырэктар бібліятэкі тав. Ліўшыц замест таго, каб па-бальшэвіцку мабілізаваць работнікаў цэнтральнай бібліятэкі на ўсямернае аказанне дапамогі чытачам у вывучэнні гісторыі партыі і дабіцца таго, каб бібліятэка ў гэтым важнейшым пытанні заняла вядучую ролю сярод бібліятэк вобласці, — займаецца вышукваннем «аб'ектыўных» прычын адставання ў рабоце, і на гэтым супакойваецца.

Усё гэта ў значнай ступені тлумачыцца і тым, што некаторыя партыйныя арганізацыі на мясцах недаацэньваюць велізарнай ролі бібліятэчнай работы ў галіне прапаганды марксізма-ленінізма, не кіруюць ёю.

Партыйныя кіраўнікі не дапамагаюць бібліятэчным работнікам у вывучэнні гісторыі партыі. Напрыклад, у бібліятэцы імені Крупскай большасць работнікаў не вывучае гісторыі ВКП(б); у бібліятэцы педтэхнікума з 8 работнікаў самастойна вывучае гісторыю ВКП(б) толькі 2. Астатнія 6 таварышаў выказалі жаданне вывучаць гісторыю ВКП(б) у гуртку, але партарганізацыя да гэтага часу не падшукала ім кіраўніка.

Гарком КП(б)Б таксама ні разу не сабраў бібліятэкараў горада і не паставіў перад імі задачы павышэння ў першую чаргу свайго ідэйнага ўзроўню, як галоўнай умовы паспяховай работы з чытачамі; не дапамог ім пачаць работу з чытачамі, самастойна вывучаючымі гісторыю ВКП(б).

В. СЦЯПАНАВА.